# [ПАРАДАК – ГЭТА ЗАЎСЁДЫ ДОБРА!]

2025 год – Год добраўпарадкавання ў нашай краіне. Ён заклікаены аб'яднаць намаганні дзяржавы і грамадства для павышэння якасці жыцця ў Беларусі. Сувязісты актыўна падтрымліваюць гэты курс, уносячы свой уклад у стварэнне зручнага, бяспечнага і эстэтычнага асяроддзя.

**Захоўваем прыроднае багацце і гістарычную памяць**

У Год добраўпарадкавання працаўнікі галіны сувязі прыводзяць у парадак не толькі свае працоўныя месцы і прылеглыя тэрыторыі, але і гарадскія вуліцы, паркі і скверы – высаджваюць хмызнякі і кветкі, уладкоўваюць газоны, прыбіраюць смецце.

У гэтым годзе сувязісты не засталіся ўбаку і ад работ па аднаўленні беларускіх лясоў. У красавіку супрацоўнікі Мінсувязі і падведамных арганізацый прынялі ўдзел у рэспубліканскай акцыі «Дай лесу новае жыццё!»: на лясных тэрыторыях Барысаўскага раёна, якія пацярпелі ад удару стыхіі летам 2024 года, высадзілі маладыя саджанцы елкі і хвоі. Пасля – падтрымалі экалагічную кампанію «Лес! Дабро! Парадак!»

З асаблівым трапятаннем сувязісты падыходзяць і да захавання гістарычнай памяці. У год не толькі добраўпарадкавання, але і 80-годдзя Вялікай Перамогі работнікі галіны даглядаюць помнікі і месцы пахаванняў воінаў-сувязістаў, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Так, напрыклад, увага нададзена Мемарыяльнаму знаку воінам-сувязістам, брацкай магіле ў а. г. Пяскі, пахаванняў на Чыжоўскіх і Маскоўскіх могілках у Мінску – ніхто не забыты.

**Камфорт і сучаснасць**

Прадпрыемствы галіны надаюць асаблівую ўвагу мадэрнізацыі інфраструктуры і стварэнню камфортных умоў для кліентаў і супрацоўнікаў.

Работнікі галіны сувязі на пастаяннай аснове падтрымліваюць у належным стане фасады будынкаў і агароджы, абнаўляюць шыльды. Прылеглыя тэрыторыі ўладкоўваюць велапаркоўкамі, усталёўваюць лаўкі, альтанкі, а таксама малыя архітэктурныя формы. Напярэдадні летняга сезона абноўлены месцы адпачынку і спорту. Напрыклад, нацыянальным паштовым аператарам на тэрыторыі базы адпачынку «Дружба» адрамантаваны альтанкі, абноўлены вулічныя трэнажоры, прыведзены ў парадак дзіцячыя пляцоўкі. Гродзенскім філіялам РУП «Белпошта» добраўпарадкаваны дзіцячы аздараўленчы лагер «Бярозка»: адрамантаваны і афарбаваны лаўкі, устаноўлены малыя архітэктурныя формы. РУП «Белтэлекам» працягнуў паляпшаць гарадское асяроддзе ў розных кутках краіны. Новыя сучасныя спартыўна-гульнявыя комплексы «ЯСНА», а таксама пляцоўкі для актыўнага адпачынку дзяцей і дарослых з'явіліся ў Кобрыне, Бабруйску, Івацэвічах і Жодзіне.

У Год добраўпарадкавання абнаўленне і адкрыццё новых аб'ектаў сувязі праходзіць асабліва сімвалічна. Напрыклад, у Гомелі адкрыты новы адміністрацыйны будынак «БелДІЭ», а таксама абноўлены офіс продажаў «Белтэлекама», а ў Мар'інай Горцы, Дзісне, Брэсце, Астрашыцкім гарадку (Мінскі раён) – аддзяленні паштовай сувязі.

Пашыраюцца і сеткі магазінаў апаратараў сувязі. Напрыклад, афлайн-крамы BELTELECOMshop адкрыліся ў Брэсце, Гродне, Магілёве і Мікашэвічах, новыя «Поштамаркеты» – у Дуброўне, Расонах, г. п. Лынтупы (Пастаўскі раён).

*Мерапрыемствы Года добраўпарадкавання робяць краіну чысцейшай і прыгажэйшай, умацоўваючы сувязь пакаленняў і паляпшаючы паўсядзённае жыццё беларусаў. Гэта наглядны прыклад таго, як сумеснымі намаганнямі – ад уборкі тэрыторый да адкрыцця новых аб'ектаў – можна будаваць камфортную і сучасную будучыню, дзе кожны робіць свой уклад у росквіт Беларусі.*

Малюнак




---

**Source URL:** *https://mpt.gov.by/paradak-geta-zausyody-dobra*